СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 31 (46), 30.11 – 06.12. 2006 г.

# СКАНДАЛЬНЫ САМІТ

## ЛУКАШЭНКА АДПОМСЦІЎ РАСІЙСКІМ ЖУРНАЛІСТАМ

15-ты, "юбілейны", саміт СНД у Мінску праходзіў у зусім несвяточнай атмасферы. Па-першае, тэрміны саміта, які мусіў адбыцца яшчэ месяц таму, былі перанесеныя. Рашэнне аб гэтым прынялі Пуцін з Назарбаевым без узгаднення з Лукашэнкам. Акрамя таго, міліцыі давялося разганяць акцыю пратэсту беларускай апазіцыі на Кастрычніцкай плошчы. Але не гэта стала прычынай гучнага міжнароднага скандалу.

Двух журналістаў газеты "Московский комсомолец" і фотакарэспандэнта газеты "Коммерсант" не пусцілі на пасяджэнне Рады кіраўнікоў дзяржаў СНД. У выніку сустрэчу пакінулі амаль усе расійскія журналісты, якія ўваходзілі ў так званы "крамлёўскі пул" – гэта значыць, былі афіцыйна акрэдытаваныя расійскім бокам для асвятлення працы міждзяржаўнай арганізацыі. У выніку асвятляць завяршэнне саміта засталася толькі адна здымачная група з Расіі.

Загад не пускаць журналістаў зыходзіў з самага верху. Не дапамагло нават умяшанне расійскага МЗС, кіраўніка прэс-службы Пуціна і кіраўніка яго адміністрацыі.

Пазней, у размове з Пуціным сам-насам Лукашэнка назваў інцыдэнт "тэхнічным непаразуменнем". Намеснік галоўнага рэдактара "Московского комсомольца" Паэглі ў інтэрв'ю прэс-цэнтру Хартыі'97 паведаміў: "Паводле нашай інфармацыі, загад паступіў асабіста ад Лукашэнкі. Звязана гэта з нашым артыкулам аб роднай вёсцы Лукашэнкі і яго сваяках". Маецца на ўвазе артыкул "Ля Лукамор'я змій зялёны. У казачнай вёсцы Лукашэнкі співаюцца ягоныя сваякі", надрукаваны "МК" ў пярэдадзень сустрэчы Лукашэнкі з Пуціным у Маскве. Маскоўская журналістка Наталля Баброва без акрэдытацыі беларускага МЗС прыехала ў родную вёску Лукашэнкі, пасля чаго напісала, што некаторыя яго блізкія сваякі зрабіліся хранічнымі алкаголікамі, альбо жывуць у жабрацтве.



**На варце**. *Мінск, 2006 год. Фота з архіву.*

"Тое, што адбылося ў Мінску, сведчыць, што існуюць краіны, дзе ўлада ў дачыненні да журналістаў паводзіць сябе яшчэ больш непрыстойна, чым расійская, – заявіў генеральны сакратар Саюза журналістаў Расіі Ігар Якавенка. – Нягледзячы на тое, што ў Расіі, як і ў Беларусі, няма свабоды слова, расійскія ўлады імкнуцца захоўваць прыстойнасць хоць бы знешне, таму расійскія журналісты з непрывычкі здзівіліся". На думку Якавенкі, скандальныя дзеянні афіцыйнага Мінска часткова выкліканыя тым, што "ніхто, у тым ліку і Беларусь, не шануе сяброўства ў СНД".

Гэта прадэманстраваў Пуцін, які нават не прысутнічаў на выніковай прэс-канферэнцыі. Затое ён правёў брыфінг у аэрапорце Мінск-2, на які не пусцілі нікога з дзяржаўных СМІ Беларусі.

Працяг на стар. 3

## БЕЛАРУСЬ ПАМІЖ РАСІЯЙ І ЕЎРОПАЙ

► СТАР. 2, 4, 7

## ТАЙНА КОШТУ БЕЛТРАНСГАЗА

► СТАР. 5

# ЦІ ПРЫСЛУХАЮЦЦА Ў БЕЛАРУСІ ДА ПРАПАНОВАЎ ЕЎРАСАЮЗА – ЭКАНАМІЧНЫЯ ВЫГОДЫ Ў АБМЕН НА ДЭМАКРАТЫЮ?

**СЯРГЕЙ КАЛЯКІН, ЛІДЭР ПАРТЫІ КАМУНІСТАЎ БЕЛАРУСКАЙ:**

## "ТРЭБА, КАБ ЛЮДЗІ ДАВЕДАЛІСЯ"

Я чуў рэакцыю афіцыйных уладаў. Калі выступала па БТ намесніца галавы адміністрацыі прэзідэнта Пяткевіч, стала ўсё зразумела. Нічога яны не прымаюць і наогул намагаюцца паказаць прапановы абсалютна нікчэмнымі. Яны іх называюць "старымі новымі прапановамі" і не бачаць для сябе нічога новага. Прынамсі, не бачаць ніякіх выгодаў для Беларусі. Што тычыцца дэмакратычных колаў, то яны ўспрымаюць вельмі сур'ёзна гэтыя прапановы. На гэтым шляху можна шукаць паразумення. І можна выпраўляць сітуацыю ў Беларусі. Мы будзем рабіць усё, каб шырокія колы грамадзян даведаліся пра гэтыя прапановы.

**ВАЛЕРЫ, ГАНДЛЯР:**

## "НІХТО Ў БЕЛАРУСІ ІХ НЕ ПАЧУЕ"

Еўрасаюз прапанаваў Лукашэнку перастаць быць Лукашэнкам. Яны выдатна разумеюць, што гэта немагчыма. З тым жа поспехам яны маглі б прапанаваць тое ж самае Фідэлю Кастра ці Кім Чэн Іру. Яны не ведаюць, што зрабіць з Беларуссю. Пухліна ёсць, але ж не ракавая. Можна прымаць прыгожыя дэкларацыі хоць штогод. У Беларусі не тое, што ніхто не адрэагуе, а нават ніхто і не пачуе. Таму што чутна гэта ўжо 15 гадоў. Для чалавека, які нешта разумее, гэта чарговая паперка Еўрасаюза. А астатнім і абмяркоўваць няма чаго. Гэта нават не інфармацыйная падзея. Працяг ранейшых заяваў.

**ПАЎЛЮК КАНАВАЛЬЧЫК, ЖУРНАЛІСТ:**

## "МОЖА ПАЧАЦЦА ГАНДАЛЬ"

Рэакцыя мусіць быць. Не ведаю, праўда, у якой форме гэта будзе. Калі меркаваць па тым, што я чую – вельмі прыязна людзі сустрэлі гэтую ініцыятыву. Рэакцыя ўладаў, я думаю, таксама будзе станоўчая. Але ж трэба паламацца для праформы. Там жа гаворка ідзе акурат пра тое, чаго баіцца апазіцыя. Дэмакратызатарам №1 у Беларусі стане ўласна сам Лукашэнка. І гэта будзе ў пэўнай форме кампраміс. Такі гандаль можа пачацца, я думаю. Але не адразу, вядома, як таго хочацца Еўрасаюзу. Гэта будзе, безумоўна, касметычная дэмакратызацыя. Для еўрачыноўнікаў. Каб ім здавалася, што працэс ідзе.

**НАТАЛЛЯ, ПЕРАКЛАДЧЫЦА:**

## "ЕЎРОПА ДЛЯ НАС – НЕ ТУТ"

Ніякай рэакцыі з боку шырокіх масаў народу не будзе. Ні адмоўнай, ні станоўчай. Бо Еўропа для нас – гэта недзе там, а не тут. Мы пакуль ні мазгамі, ні душою не еўрапейцы.

**АНАТОЛЬ ЛЯБЕДЗЬКА, ЛІДЭР АБ'ЯДНАНАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ПАРТЫІ:**

## "ПРЫСЛУХАЮЦЦА, КАЛІ НА ПЛОШЧУ ВЫЙДУЦЬ 30 000"

Пазітыўным момантам паслання з'яўляецца тое, што яно скіраванае не толькі да афіцыйнага Мінска, але і да грамадзянаў Беларусі. Гэта вельмі важна. Наконт рэакцыі. Яна будзе, калі пра гэтае пасланне будуць ведаць людзі. Гэта пытанне да нас. Ці зможам мы пераказаць тое, што сказаў афіцыйны Брусель, зразумелай мовай нашым людзям. Што ў іх ёсць рэальная альтэрнатыва. Калі гэтае пасланне прыйдзе ў кожны дом, то можна сказаць, што яно дайшло да людзей. І мы зможам разлічваць на нейкі адказ на гэтае пасланне. Што тычыць афіцыйных уладаў, то гэтае пытанне вельмі складанае. І я думаю, што можна разлічваць на поспех, зноў жа, калі на плошчы Каліноўскага будзе стаяць 30 000 людзей. Тады афіцыйны Мінск больш хутка адрэагуе на гэтае пасланне.

**АЛЯКСАНДР, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## "РЭАКЦЫЯ БУДЗЕ НАСЦЯРОЖАНАЯ"

Нашы людзі Еўропы пабойваюцца і недалюбліваюць яе. Ім сапраўды лягчэй у Саюзе. І афіцыйная прапаганда не зусім хлусіць, калі палохае беспрацоўем. Ці выжыве завод халадзільнікаў ці "Гарызонт" у Еўрасаюзе? А калгасы з фермерамі? Дык навошта ім туды імкнуцца? Таму рэакцыя будзе насцярожаная. А БТ разам з дзяржаўнымі газетамі пастараюцца, каб гэтая насцярожанасць перарасла ў поўны недавер.

**УЛАДЗІМІР ФЁДАРАЎ, ПАЛІТОЛАГ:**

## "УЛАДЫ ЗРОБЯЦЬ ВЫГЛЯД, ШТО РЭАГУЮЦЬ"

Можна меркаваць, што нейкі водгук пойдзе з боку набліжаных да Лукашэнкі асобаў – накшталт Пяткевіч. Таму што тыя патрабаванні, якія высоўвае Еўрасаюз, для беларускага кіраўніцтва непрымальныя. Апазіцыя, безумоўна, адгукнецца. Яна таксама разумее, што ўлады на гэта не пойдуць. Але гэта дае ёй магчымасць падчас мясцовай выбарчай кампаніі давесці да грамадзянаў тое, што Еўропа зацікаўленая ў Беларусі. Але толькі ў вольнай і дэмакратычнай Беларусі. Як адрэагуюць на гэта грамадзяне, сказаць цяжка. Шмат залежыць ад таго, якім чынам гэтая інфармацыя будзе да іх даходзіць. На сённяшні дзень улада памылак вялікіх не робіць. Яна падтрымлівае ў жыхароў пачуццё насельнікаў крэпасці ў аблозе.

**ЗМІЦЕР ШЫМАНСКІ, СТАРШЫНЯ ГАРАДСКОЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПАРТЫІ БНФ, БРЭСТ:**

## "АСАБЛІВЫХ ХВАЛЯВАННЯЎ НЕ ПРАДБАЧЫЦЦА"

Натуральна, існуючая ўлада не зацікаўленая ў тым, каб інфармацыя аб еўрапейскіх прапановах стала вядомая вялікай колькасці насельніцтва. Максімум, на што гэтая ініцыятыва можа паўплываць – гэта павелічэнне колькасці людзей, якія падчас сацыялагічных апытанняў выказваюцца за інтэграцыю Беларусі ў Еўрасаюз. Вось і ўсё. Ніякіх асаблівых хваляванняў з нагоды гэтых прапановаў я не прадбачу. Калі б вы памыліліся нумарам і задалі гэтае пытанне якому іншаму чалавеку, адказ быў бы: "Якія прапановы? Што да чаго?" Таму мы ў сваіх мясцовых бюлетэнях будзем агучваць тыя прапановы, каб людзі зразумелі, што Еўрасаюз – не вораг, а наш стратэгічны партнёр. Берасцейцы ведаюць, як жывуць людзі за блізкай мяжою. Але ўлічваючы тое, што самі жывуць горш, яны спрабуюць знайсці сабе апраўданне і супакаенне. Маўляў, не ўсё так добра за мяжой, як бачыцца.

# СКАНДАЛЬНЫ САМІТ

## ЛУКАШЭНКА АДПОМСЦІЎ РАСІЙСКІМ ЖУРНАЛІСТАМ

**(Працяг. Пачатак на стар.1)**

На брыфінгу ў аэрапорце Пуцін паведаміў, што падчас яго сустрэчы з Лукашэнкам дасягнутая дамоўленасць аб стварэнні “сумесных прадпрыемстваў” з удзелам Газпрома і Белтрансгаза на парытэтных пачатках. Але як гэта адаб’ецца на цэнах на газ для Беларусі, па-ранейшаму невядома. Усе пытанні, як заявіў Пуцін, павінны быць вырашаныя на экспертным і карпаратыўным узроўнях да канца году.

Між тым, у той самы дзень, калі ў Мінску адбыўся скандал, кіраўніку ўрада Беларусі Сідорскаму, які прыехаў у Маскву, было адмоўлена ў сустрэчы з расійскім прэм’ер-міністрам Фрадковым.

Што тычыцца ўласна саміта, дык плёну ад яго было няшмат. Не ўдалося падпісаць, напрыклад, дакумент, які тычыцца афармлення дзяржаўных межаў паміж краінамі СНД. Яшчэ напярэдадні міністр замежных спраў Украіны Тарасюк заявіў у Мінску, што яго краіна катэгарычна супраць самой фармулёўкі, дзе гаворыцца пра “агульную знешнюю мяжу” Садружнасці. Абмеркаванне ж рэформы СНД, праект якой падрыхтавала дэлегацыя Казахстана, адкладзена, як мінімум, да чэрвеня наступнага году.

Саміт выліўся ў высвятленне адносінаў паміж Расіяй і паасобнымі краінамі СНД, незадаволенымі палітыкай Крамля ў сферы энергетыкі. Дастакова згадаць Грузію і Украіну. Не менш напружаныя адносіны складваліся апошнім часам паміж Мінскам і Масквой. Таму аглядальнікі, у тым ліку ў Расіі, не выключаюць, што скандал з маскоўскімі журналістамі быў спланаваны загадзя, каб лішні раз націснуць на Лукашэнку. Але адказнасць за інцыдэнт нясе ўсё ж беларускі бок, які прымаў гасцей. Уявіць сабе падобны скандал, скажам, на саміце НАТО, які паралельна адбываўся ў Рызе, проста немагчыма.

Прэзідэнт ЗША Джордж Буш, які браў удзел у гэтым саміце, падчас сустрэчы ў сталіцы Латвіі з Аляксандрам Мілінкевічам і іншымі прадстаўнікамі апазіцыі гаварыў наўпрост: “Побач, праз мяжу, знаходзіцца Беларусь – месца, дзе мірных дэманстрантаў б’юць, а апазіцыйныя лідэры “знікаюць” пры дапамозе агентаў жорсткага рэжыму. Існаванне такой дыктатуры побач з намі абражае сумленне Еўропы і сумленне Амерыкі. Мы гаворым народу Беларусі: наша ўяўленне пра адзіную, свабодную і мірную Еўропу ўключае і вас, і мы стаім побач з вамі ў вашай барацьбе за свабоду”.

Два саміты праходзілі ў дзьвюх суседніх дзяржавах – Беларусі й Латвіі. Але адбываліся яны як быццам на розных планетах.

**Аглядальнік**



# ВІНШАВАННІ КАЗУЛІНУ

**Аляксандр Казулін, асуджаны сёлета на пяць з паловай гадоў турмы, з 20-га кастрычніка трымае за кратамі галадоўку пратэсту. У дзень нараджэння эксандыдату ў прэзідэнты ўпершыню дазволілі спатканне з жонкай і дзецьмі. Павіншаваць Казуліна да калоніі «Віцьба-3» прыехалі дзясяткі людзей. Віцебск, 25 лістапада 2006 году**

# ДЗЕНЬ ГЕРОЯЎ

27 лістапада ў Беларусі адзначылі 86-ю гадавіну Слуцкага збройнага чыну – народнага паўстання супраць бальшавіцкай улады. Сёлета напярэдадні памятнай даты ў Слуцку адбыўся мітынг, арганізаваны сябрамі Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ. Акцыя была ўпершыню за шмат гадоў дазволеная мясцовымі ўладамі.

Менавіта ў лістападзе 1920 году прайшоў з’езд Случчыны. Яго дэлегаты прынялі рэзалюцыю, у якой віталі ўрад БНР і заявілі катэгарычны пратэст супраць савецкай акупацыі Беларусі. Было прынята рашэнне падняць паўстанне за незалежную Беларусь.

Рада сфармавала брыгаду, што складалася з двух палкоў: 1-га Слуцкага і 2-га Гразаўскага. Баявыя дзеянні пачаліся 27 лістапада. Слуцкая брыгада зрабіла некалькі паспяховых атак на Чырвоную Армію каля Капыля, Цімкавічаў і Вызна. Супраціў бальшавіцкім войскам аказвалі і звычайныя сяляне. Разгарэлася сапраўдная партызанская вайна. Аднак сілы былі няроўнымі. 31 снежня паўстанцы былі вымушаныя перайсці праз мяжу ў Польшчу, дзе былі раззброеныя. Тагачасныя падзеі замоўчваліся афіцыйнай савецкай гістарыяграфіяй.

Васіль Быкаў прысвяціў трагічным слуцкім падзеям апавяданне «На Чорных Лядах».

26-га лістапада адзначаўся таксама дзень нараджэння беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча. Актывісты КХП-БНФ у гэты дзень прымацавалі да помніка класіку ў Віцебску бел-чырвона-белы сцяг.



**Святочная Імпрэза** *каля будынка, у якім 27 лістапада 1920 году была абвешчаная Слуцкая Рада. Слуцк, 26 лістапада 2006 году. Фота Радыё Свабода.*

# “НЯМА НІ ЛАСТАВАК, НІ СОНЦА...”

## ЛУКАШЭНКА СПРАБУЕ НАПАЛОХАЦЬ КРЭМЛЬ... І ЎЛАСНЫ НАРОД

Увесь мінулы тыдзень беларускія ўлады падбіралі фармулёўкі, каб адказаць на прапановы і ўмовы Еўрасаюза. Прычым відавочным было жаданне афіцыйнага Мінска, каб суайчыннікі даведваліся пра новую стратэгію ЕС не з арыгінальнага тэксту, а праз каментары афіцыйных асобаў.

Намесніца кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Наталля Пяткевіч назвала прапановы і ўмовы Еўрасаюза “выключна ідэалагічным зваротам”. Пяткевіч паскардзілася, што ў гэтым дакуменце нібыта няма аніякай канкрэтыкі – толькі агульныя словы пра ахову прыроды, абарону жанчын і г.д. Высокапастаўленая чыноўніца патлумачыла суграмадзянам, што здарылася з тымі краінамі, якія паддаліся на падобныя прапановы і прадаліся: “Абяцалі манну нябесную, рай незямны, ластаўкі ў небе, яркае сонца. Што сёння ў гэтых краінах? Галодныя ваўкі ў цемры, якія выюць на Луну. Няма ні ластавак, ні сонца, нічога...”

Наталля Пяткевіч яўна прэтэндуе на лаўры беларускага Стывена Кінга. Ад жахлівага відовішча краінаў, пазбаўленых сонца, ластавак і пакінутых сам-насам з галоднымі ваўкамі, стыгне кроў. Праўда, намесніца кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі забылася ўдакладніць, якія дзяржавы напаткаў такі непрывабны лёс. Літву? Польшчу? Украіну? Здаецца, там і без дыктатуры сонейка ўзыходзіць штодня. Узровень жыцця насельніцтва ў краінах ЕС значна вышэйшы за беларускі. Так што, выглядае, што замест размовы па сутнасці чыноўніца пачала наводзіць цень на пляцень.

Літаратурны талент Наталлі Пяткевіч відавочна большы, чым Паўла Якубовіча. Галоўны рэдактар “Советской Белоруссии” не здолеў намаляваць такую ўражвальную карціну. У праграме Радыё Свабода ён проста назваў дакумент ЕС “антылукашэнкаўскім”. Цікава, што пры гэтым Якубовіч заклікаў не адкідаць новую стратэгію Еўрасаюза, але абмеркаваць яе.

Пяткевіч і Якубовіч вельмі цьмяна казалі пра прапановы ЕС. Але характэрна, што пра ўмовы Еўрасаюза яны наогул ні слоўцам не згадалі. А гэта самая цікавая частка новай стратэгіі. Бо ЕС нічога не патрабуе ДЛЯ СЯБЕ: ні “Белтрансгазу”, ні далучэння Беларусі да нейкіх блокаў альбо дзяржаў. Усе ўмовы тычацца выключна правоў беларусаў на годныя ўмовы жыцця і працы.

Якубовіч таксама адзначыў, што Еўрасаюз фактычна прапанаваў Лукашэнку “нейкія схаваныя козыры ў яго канфрантацыі з крамлёўскім кіраўніцтвам”. Дакладней было б казаць пра тое, што Лукашэнка можа скарыстаць зварот ЕС менавіта ў такой якасці. Аднак пакуль што еўрапейская карта не прыдатная афіцыйнаму Мінску. Ён палохае Маскву саюзам з Кіевам.

Выглядае, што Лукашэнка спрабуе напалохаць Крэмль рознымі сцэнарамі, ужо нават не зважаючы на тое, наколькі яны рэалістычныя: то нафту мы будзем купляць у Венесуэле, то разам з Украінай трымаць у страху ўвесь кантынент. Аднак блеф у гэтых выпадках да такой ступені відавочны, што не мае шанцаў на поспех.

Таму Лукашэнка ўжыў больш моцны сродак. Пагадненне пра стварэнне адзінай расійска-беларускай сістэмы супрацьпаветранай абароны меркавалася падпісаць на мінулым тыдні. Усё было падрыхтавана, аднак раптам гэтую працэдуру адклалі. І вось гэта для Масквы сапраўды непрыемна. Дагэтуль вайсковае супрацоўніцтва заставалася ці не адзінай беспраблемнай галіной расійска-беларускіх дачыненняў. Цяпер Лукашэнка спрабуе звязаць яе з сітуацыяй на газавым, нафтавым ды іншых франтах, дзе хаўруснікі высвятляюць адносіны.

**Валер Філін**

# ПАМІЖ КУБАЙ І КОНГА

*Уплывовы часопіс “Economist” апублікаваў “Індэкс дэмакратыі”-2006 па выніках штогадовага даследавання ў краінах свету. Беларусь заняла ў ім 128-е месца, Расія – 102-е, Украіна – 52-е.*

Ацэнка ўзроўню дэмакратыі праводзіцца ў пяці катэгорыях. Улічваецца, па-першае, шматпартыйнасць і плюралізм на выбарах у заканадаўчыя органы ўлады; па-другое, дэмакратычнасць дзеянняў выканаўчай улады; па-трэцяе, грамадзянская актыўнасць насельніцтва; затым – узровень палітычнай культуры грамадства. І толькі ў апошнюю (але не паводле важнасці) чаргу пры выстаўленні сярэдняга бала ўлічваецца наяўнасць грамадзянскіх свабодаў: свабода выказванняў, свабода сходаў і г.д. У прынцыпе, гэта тыя самыя ўмовы, якія выстаўляе Еўрасаюз Беларусі для супрацоўніцтва.

У раздзел **цалкам дэмакратычных** увайшлі 27 краінаў. Першае месца займае Швецыя, якая набрала 10 балаў ва ўсіх катэгорыях, акрамя…палітычнай культуры (9,38). Да прыкладу, Ісландыя і Галандыя, якія ідуць следам, у гэтай катэгорыі набралі па 10 балаў. Злучаныя Штаты, паводле індэксу “Economist”, апынуліся на 17-м месцы, крыху апярэдзіўшы Чэхію. Замыкаюць гэты раздзел Славенія і Уругвай.

Як ні дзіўна, краіны Балтыі, а таксама Польшча, патрапілі ў другі раздзел — **краінаў, у якіх развіваецца дэмакратыя**. Напрыклад, Эстонія заняла ў спісе 33-е месца, паміж Тайванем і Італіяй. Літва дзеліць 39-е месца з рэспублікай Каба-Вердэ, а Латвія (43-е) апярэдзіла Польшчу (46-е). У гэтых трох краінах прыкладна аднолькавы ўзровень палітычнай культуры (каля 5,5) але ўзровень грамадзянскіх свабодаў дасягае 9 і вышэй. Прыкладна такія ж балы набрала і Украіна, толькі вось дэмакратычнасць яе ўрада ацэньваецца даволі нізка.

Трэцюю катэгорыю складаюць так званыя **гібрыдныя рэжымы.** У лік краінаў з такім рэжымам патрапіла Расія з яе “суверэннай дэмакратыяй”. Яна, праўда, апярэдзіла Грузію і Малаві, але саступіла Венесуэле і вялізнай групе афрыканскіх краінаў – ад Сенегала да Кеніі. У Расійскай Федэрацыі досыць высокі паказчык у графе “плюралізм”, але дзейнасць расійскага ўрада ацэньваецца толькі на тройку. Замыкаюць “гібрыдны” раздзел Арменія, Кыргызстан і Ірак.

Беларусь жа звыкла апынулася ў апошнім раздзеле – **аўтарытарныя рэжымы.** Наша краіна набрала крыху больш балаў, чым Азербайджан. Як ні дзіўна – за кошт адносна высокай палітычнай культуры – 4,38. Па гэтым паказчыку Паўночная Карэя, якая займае апошняе, 167-е месца, набрала 0, 58 бала, а паводле ўзроўню свабоды – 0,0! У Беларусі свабода ацэньваецца на 3,53. Так што, хоць у выбарчым працэсе і дэмакратычнасці ўладаў мы не дацягваем і да тройкі, нам ёсць да чаго імкнуцца.

# ТАЙНА КОШТУ БЕЛТРАНСГАЗА

## БЕЛАРУСКА-РАСІЙКІЯ ПЕРАМОВЫ ЗАЙШЛІ Ў ТУПІК?

Чарговы раўнд перамоваў паміж Беларуссю і Расіяй у Мінску прайшоў практычна незаўважна. Хоць сустрэча абяцала сенсацыю – галоўным пытаннем на ёй павінна была стаць не толькі цана на газ для Беларусі ў 2007 годзе, але й магчымасць продажу прадпрыемства “Белтрансгаз” расійскаму канцэрну “Газпром”. Расійскі бок на перамовах прадстаўляў прэм’ер-міністр Міхаіл Фрадкоў і новы намеснік кіраўніка Газпрома Валеры Голубеў, Беларусь – прадстаўнік урада Уладзімір Сямашка і кіраўніцтва Белтрансгаза.

Гэтую сустрэчу ўсе канечне заўважылі б, калі б нарэшце былі абнародаваныя вынікі ацэнкі Белтрансгаза, праведзенай галандскім банкам ABN Amro. Гэтага, аднак, не адбылося. І не таму, што галандцы не паспелі падрыхтаваць ацэнку – проста з нейкіх прычынаў удзельнікі перамоваў вырашылі пакуль не называць канкрэтныя лічбы. Магчыма, адказ “чаму” хаваецца ў саміце СНД, які адбываецца ў Мінску ў момант, калі пішуцца гэтыя радкі. Сустрэча і без таго няпростая, каб яшчэ больш напальваць атмасферу. А можа, проста вырашылі нікому не псаваць настрой напярэдадні юбілея СНД?

Тым не менш, беларускі бок апошнім часам яўна намагаўся азмрочыць настрой расійцам. Гучалі і заявы Лукашэнкі пра падвышэнне транзітных мытаў на тавары, якія ідуць з Еўрасаюза ў Расію праз Беларусь. І заявы аб тым, што Мінску й Кіеву неабходна праводзіць адзіную палітыку на газавых перамовах з Масквой. Прамільгнула нават шалёная прапанова стварыць саюзную дзяржаву Беларусі і Украіны паводле прынцыпу “супраць каго сябраваць будзем?”

Па-сутнасці, усё гэта рабілася дзеля таго, каб у жыхароў Беларусі стварылася ўражанне, быццам Расія, якая пе-



belzhaba.com

раходзіць на рынкавыя цэны на газ, здраджвае нашай краіне і нават шантажуе яе.

Але гэта не зусім так. Сёння Беларусь – адзіная краіна ў СНД, якая атрымлівае газ паводле ўнутрырасійскіх цэнаў. Вінаватая ў гэтым сама Расія, якая не стала падымаць цэны на газ для Беларусі з-за прэзідэнцкіх выбараў 2006 году, тым самым падтрымаўшы Лукашэнку. Другая прычына палягае ў тым, што акурат тым часам Газпром афармляў ва ўлас-

**У Маскве на пагрозы Лукашэнкі гэтым разам адрэагавалі надзвычай спакойна.**

насць участак газаправоду “Ямал-Еўропа”, які праходзіць праз тэрыторыю Беларусі. У абмен на падтрымку Лукашэнка не аднойчы абяцаў прадаць расійскаму боку частку акцыяў Белтрансгаза, і не толькі. Яшчэ ў 2002 годзе паміж дзьвюма дзяржавамі было падпісанае міжурадавае пагадненне, якое прадугледжвае продаж актываў Белтрансгаза Газпрому. Аднак дагэтуль ад выканання сваіх абавязацельстваў Лукашэнка ўхіляўся. Замест гэтага ён абвінавачвае Расію ў спробах задушыць Беларусь.

Паводле інфармацыі, якая ёсць на сённяшні дзень, эксперты з ABN Amro падрыхтавалі 4 варыянты ацэнак, але назавуць кошт Белтрансгаза ў Маскве на пачатку снежня, падчас наступнага этапу перамоваў Расіі і Беларусі па газавай праблеме.

Аднак Масква, наколькі можна меркаваць, гэтым разам настроеная рашуча. Не выпадкова ж Газпром яшчэ да завяршэння беларуска-расійскіх перамоваў зацвердзіў праект бюджэту кампаніі на 2007 год, зыходзячы з цаны на газ для Беларусі у 200 даляраў за 1 тысячу кубаметраў.

А гучныя палітычныя заявы наконт росту коштаў транзіта і дружбы з Украінай расійскі бок увогуле не прымае ўсур’ёз. У Маскве на пагрозы Мінска гэтым разам адрэагавалі надзвычай спакойна. Кіраўнік аддзела Беларусі Інстытута краінаў СНД Аляксандр Фадзееў лічыць — гэта адбылося таму, што «пагрозы Лукашенкі могуць нашкодзіць толькі яму самому».

«Я думаю, што тут манеўр у адміністрацыі Беларусі вельмі абмежаваны, — лічыць маскоўскі эксперт. — Таму што цяперашнія транзітныя мыты ўстаяліся. У гэтым выпадку Беларусь сапсуе адносіны з Еўрасаюзам, які адпраўляе грузы. А ЕС — гэта асноўны рынак збыту беларускіх тавараў. То бок Еўрасаюз адразу ўвядзе меры, якія вельмі моцна адаб’юцца на беларускім экспарце. Такім чынам, Беларусь не можа безадказана паводзіць сябе ў гэтым накірунку”. Што тычыцца другой пагрозы Лукашенкі — наконт змовы з Кіевам у справе цэнаўтварэння на расійскі газ, — дык, на думку Аляксандра Фадзеева, і гэтая авантура можа каштаваць кіраўніку Беларусі дорага. «Украіна ўжо дамовілася па цэнах на газ на наступны год, і яна не будзе гуляць з Беларуссю ў гэтую гульню. Але той факт, што Беларусь спрабуе збудаваць нейкі альянс краін-спажыўцоў расійскага газа ды іншых энергарэсурсаў, нафты, напрыклад, які б быў скіраваны супраць Расіі, супраць яе палітыкі на энергарынку, гэта вельмі небяспечная гульня. І Расія мусіць зрабіць з гэтага высновы. Яны могуць быць толькі жорсткімі, адэкватнымі і будуць ставіць Лукашэнку на месца…Расія павінна паказаць сваю пазіцыю, і гэта павінна быць жорсткая дэманстрацыя» — лічыць расійскі палітолаг.

Па шчырасці, цяжка сказаць, што лепей. Разлічыцца за пастаўкі газа Белтрансгазам і атрымліваць танны газ, як гэта робяць Арменія і часткова Украіна, ці — шукаць магчымасці плаціць па 200 даляраў за тысячу кубоў, і тым самым ставіць пад удар і без таго не вельмі здаровую эканоміку Беларусі? Відавочна адно – так, як раней, ужо не будзе. Атрымаць “газ у абмен на пацалункі” (як часта называлі адносіны з Беларуссю ў Маскве) больш не атрымаецца. І ў тым, што ў Мінску гэтага не зразумелі раней, не падрыхтаваліся да зменаў, ёсць непасрэдная віна кіраўніцтва Беларусі.

**Алег Ман**

# ЦІ ЧЫТАЮЦЬ У БРУСЕЛІ “ЗВЯЗДУ”?

Саюздрук

## АЛЬБО ПІСЬМЕННІКАЎ – НА СЯЛО

Цікава, ці чытаюць у Брусэлі “Звязду”? У адным з апошніх нумароў нехта Аляксандраў гэтак апантана зрывае маскі з хціывых еўрабюракратаў, што цяжка не даць яму веры.

*“Ну не могуць нават уявіць сабе еўрачыноўнікі, што беспрацоўе ў Беларусі сёння вагаецца ў межах аднаго працэнта. У той жа Германіі гэты паказчык у 10 разоў вышэй! Беларускія дарогі смела дадуць фору літоўскім і польскім. А пра навучанне ў польскіх універсітэтах лепш спытаць беларускіх студэнтаў, якія на хвалі беспарадкаў падчас прэзідэнцкіх выбараў накіраваліся грызці граніт еўрапейскай навукі. Ох, і не салодкім ён ім паказаўся”.*

Хай бы таварыш Аляксандраў прапанаваў нашаму высокааплатнаму, гэта значыць, трохсотбаксаваму, працаўніку памяняцца з нямецкім пяцістаеўравым беспрацоўным. Ці, напрыклад, гаротным студэнтам вярнуцца з негасціннай Еўропы ў родную Беларусь. Ці прапанаваў пакаяцца ў сваіх “страшных злачынствах” Казуліну і Севярынцу з Клімавым. Думаю, ва ўсіх людзей, пра якіх так клапоціцца “Звязда”, знайшлася б пара словаў у адказ. І, баюся, мала не падалося б таварышу Аляксандраву.

А ў “Советской Белоруссии” ажно на двух палосах абмяркоўвалі, як вярнуць да жыцця такі знікаючы падвід чалавека разумнага, як чытач? Найбольш цікавае рашэнне прапанаваў, на маю думку, намеснік міністра культуры Валерый Гедройць.

*“Вопрос приобщения к чтению — проблема комплексная. Силами только школы, или только семьи, или Министерства культуры либо Министерства информации, или писателей ее не решить. Только совместными усилиями мы может прийти к какому–то положительному результату. Что касается нашего министерства, то у нас есть разнообразные возможности приобщения людей к чтению. С каждым годом приобретает все больший размах День белорусской письменности, проводимый нашим министерством совместно с Министерством информации. Это и встречи с писателями, журналистами, и выставки–продажи книг... И даже акция «Мастера искусств — труженикам села»... Я настаивал на том, чтобы в состав творческих бригад, выезжающих в сельские дома культуры, клубы, были включены писатели. Выступают звезды эстрады и тут же — литераторы. Вы бы посмотрели, как их слушают, как люди соскучились по встрече с живым белорусским писателем. Его обступают, просят автографы... “*

“Кранаюць рукамі, паказваюць пальцамі”, хочацца працягнуць словы Гедройця. Бо “живой белорусский писатель” у сённяшняй РБ – сапраўднае дзіва. Бібліятэкам забаранілі ладзіць чытацкія канферэнцыі з удзелам сяброў Саюза беларускіх пісьменнікаў. Нядаўна, напрыклад, студэнцкую канферэнцыю ў БДУ адмянілі, бо арганізатары неасцярожна запрасілі на яе… паэта Ніла Гілевіча. А што тычыцца прыўладнага Саюза пісьменнікаў Беларусі, я б на месцы Мінкульта вазіў бы іх па вёсках і за грошы паказваў бы. Чытачоў ад гэтага наўрад ці прыбавіцца, але ўсё ж-такі занятак для сяброў правільнага саюза.

Тыднёвік БЕЛТА “7 дней” напалохаў артыкулам “Грабовой подбирался к Беларусі”. Гаворка ў ім ідзе пра вядомага расійскага махляра, які някепска зарабіў, “вяртаючы да жыцця” дзяцей, што загінулі ў Бесланскай трагедыі.

*“…«феномен Грабового» начал широко пропагандироваться в недавно появившемся на свет белорусском ежемесячнике «Бессмертие». Скорее всего, пропагандистский всплеск вокруг «феномена Григория Грабового» на страницах новорожденного белорусского издания неслучайно совпал по времени с реальной перспективой разоблачения его на «исторической родине», что и побудило автора «Учения» искать точки приложения своих уникальных способностей в нашей стране. Данная инициативная группа создала на общественных началах «Белорусский центр распространения учения Григория Грабового» и обратилась к Президенту Республики Беларусь А.Г. Лукашенко. В своем письме к президенту активисты новоявленного движения (среди которых были и люди с учеными степенями), перечислив «почетные звания» академика Г. Грабового и его «революционные открытия», предложили создать творческую группу из ведущих ученых Национальной академии наук Беларуси для изучения и разработки программы практического применения теории Грабового в нашей республике”.*

Шкада, што ў Акадэміі навук Беларусі, куды адміністрацыя прэзідэнта накіравала праект на экспертызу, спынілі гэты балаган. Рэзанансу хапіла б на доўгія гады. Тэма апісаная яшчэ ў камедыі Крапівы “Хто смяецца апошні?”Але чаму шарлатаны кінуліся менавіта ў нашу краіну? Ды яшчэ мелі смеласць непакоіць высокую асобу? Можа, Грабавой адкульсці даведаўся, што правадыр усіх часоў і народаў таварыш Сталін у свой час усур'ёз запытваўся ў савецкіх акадэмікаў – ці можа сучасная навука забяспечыць несмяротнасць? Не ў філасофскім, а ў самым, што ні ёсць, фізічным сэнсе. Асцярожныя акадэмікі цягнулі з адказам, пакуль правадыр не адправіўся ў лепшы свет.

**Алесь Канюціч**

# ШТО ЗРАБІЎ ВІНЦУК ВЯЧОРКА?

Як робяцца хвалі

## АЛЬБО КАЗАНЬ – СТАЛІЦА ТАТАРСТАНА

На мінулым тыдні Лукашэнка чыстасардэчна прызнаўся – у фальсіфікацыі выбараў. Гэта не важна, на чыю карысць была фальсіфікацыя, галоўнае, што яна была. Тут жа ягоны палітычны апанент Вінцук Вячорка заявіў, што падасць скаргу на парушэнне закона ў бліжэйшы панядзелак, 27 лістапада. Пра гэта паведамілі ўсе радыёстанцыі. Прайшоў і панядзелак, і аўторак. А па радыё нічога не чуваць. Ці падаў Вячорка скаргу, ці не падаў. Калі не падаў – чаму?

Ад панядзелка Радыё Свабода пачало паўтараць у ранішнім эфіры начную праграму мінулага вечара, і дырэктар радыё, спадар Лукашук папрасіў слухачоў адгукнуцца – ці варта гэта рабіць? Мой асабісты водгук – варта. Бо праграма цікавая, як назвалі яе самі стваральнікі, пазітыўная. З чалавечым абліччам. Адзіная заўвага. Калі вядоўцы Знаткевіч і Караткевіч заканчваюць гутарку з госцем у простым эфіры, любяць яны збянтэжыць гэтага госця раптоўнымі пытаннямі: А ці карыстаецеся інтэрнэтам? А якую кніжку прачыталі? А што рабілі да 1917 году?.. Госць не чакае допыту з прыстрасцем, і яго адказы, як правіла, выходзяць скамечаныя і недарэчныя.

А цяпер – асабісты зварот да Каці Золатавай з Еўрапейскага Радыё. Каця, золатка, звярніце ўвагу на націскі. Вы прамовілі: “Папа Рымскі казаў казАнь”. Казань – гэта сталіца Татарстана.. А ў бажніцы святар кажа кАзань або казАнне.

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# ПАМІЖНАЕ

## ТАК БЕЛАРУСЬ І ТОПЧАЦЦА ПАМІЖ ЕЎРОПАЙ ДЫ РАСІЯЙ

"Калі Пан Бог у першыя шэсць дзён тварэння стварыў бы й камароў, мабыць, у сёмы Ён бы ўжо нармальна не адпачыў".

Гэта – верш. Проста я перапісаў яго не "слупком", як у арыгінале, і – атрымалася проза.

Так цяпер модна пісаць – каб было і не проза, і не паэзія. Нешта "паміж".

На розных "вёснах" і "восенях" паэзіі камічна бывае назіраць, як аўтары пры дапамозе мускулатуры твару і размахвання рукамі намагаюцца надаць сваім тэкстам "вершападобнасць".

А мы цяпер увогуле жывём "паміж". СССР распаўся ў друз, але ягоныя парэшткі ўсё яшчэ ў нейкім браджэнні, усё няма канчатковай акрэсленасці. СНД – "паміжнае", недарэчнае ўтварэнне. Крэмль марыць аб адраджэнні "единой и неделимой"; былыя "сёстры-рэспублікі" агрызаюцца; толькі адна як бы "з братняю Руссю", ды ўжо адчула смак незалежнасці. А мо проста яе "бацька" ніяк не можа назваць кошт сваёй самастойнасці. Цяпер над ім толькі Бог, у якога ён, вядома, не верыць, — і так не хочацца займець іншага начальніка...

Так Беларусь і топчацца паміж Еўропай ды Расіяй. А тая, у сваю чаргу, не можа вызначыцца: яна сама – Еўропа ці Азія? Ці нешта – паміж?

А грамадскі лад? Што цяпер у Беларусі – ужо як бы й не сацыялізм, але й не капіталізм. Нешта сярэдне-шэрае.

Толькі вось паміж дэмакратыяй і дыктатурай наша Бацькаўшчына нядоўга дрэйфавала. Уляпалася ў дыктатуру. Усур'ёз і, здаецца, надоўга. Хоць зноў жа – не адважваюцца (а хацелася б!) вярнуцца зусім ужо ў 37-мы год. Арыштоўваюць, садзяць, лютуюць "праваломныя" органы – а ўсё ж новых Курапатаў няма. Пакуль няма, дзякаваць Богу.

І з Богам адносіны – "паміжныя". Як бы ўжо й няма адкрытых атэістаў, за выключэннем "праваслаўных". Але ці многа такіх, хто, як дзеці, шчыра верыць? А з тых, хто верыць – ці шмат асобаў, якія жывуць па Хрыстовых запаветах?

А хто хоча верыць – разрываецца паміж праваслаўем, каталіцызмам ды мноствам іншых канфесій. І як тут разабрацца, хто з іх напэўна ведае дарогу ў рай?

І літаратура неяк завісла паміж "сацрэалізмам" і "постмадэрнізмам". "Ганна завіхалася ля печы", — так ужо не будзеш пісаць, але й пра фекаліі, сперму і ваніты не надта выходзіць. Пазнавата гэты паток да Беларусі дабраўся. "Свежасць" страціў, калі можна так сказаць пра гэтую з'яву. Зрэшты, сёй-той спрабуе ўвайсці ў гэтую раку, дзе ўжо апаражніўся цэлы легіён – ад Чарльза Букоўскага да Уладзіміра Сарокіна.

Пісьменнікам у Беларусі цяпер увогуле цяжка. Даводзіцца выбіраць паміж двума Саюзамі. У адным, старым – проста пісьменнікі. У другім – "інжынеры лукашэнкаўскіх душ". "Старым" забаронена ўсё, — новыя маюць сытную паліўку... Ды вось бяда, шэпча такому нейкі ціхі голас: ты ўжо, браце, — не Сотнікаў, а Рыбак!.. І ўжо не радуюць пахвалы "аднасрэбнікаў" у рэжымным друку.

* * *

Так вось і жывем – паміж святлом і цемраю, адвагай і баязлівасцю, праўдай і няпраўдай, нараджэннем і смерцю.

Так было, ёсць і будзе.

Нармальна ўсё, хлопцы.

**Алег Аблажэй**

# ФОТАФАКТ



**У 194-ю гадавіну** *пераходу Напалеона праз Бярэзіну адбылася цырымонія развітання з парэшткамі жаўнераў французскай арміі. Парэшткі былі знойдзеныя пошукавым батальёнам Мінабароны Беларусі. Мінская вобласць, Брылёўскае поле, 26 лістапада 2006 году.*

# Невядомая Беларусь

**30 лістапада** 1595 году атрад Налівайкі ўварваўся ў Магілёў. Казакі паводзілі сябе як бандыты – забівалі і рабавалі месцічаў, і баяліся толькі рэгулярнага войска Рэчы Паспалітай. Дачуўшыся, што падыходзіць дзяржаўная армія, яны, не чакаючы, пакінулі Магілёў праз два тыдні пасля захопу.

**1 снежня** 1856 году адкрыўся Віленскі музей старажытнасцяў, заснаваны беларускім археолагам і гісторыкам Яўстахам Тышкевічам. Апроч ягонага брата Канстанціна, свае калекцыі новаму музею перадалі Уладзіслаў Сыракомля, Адам Кіркор, Тэадор Нарбут, Францішак Багушэвіч. Напрыканцы 19 ст. у фондах музея налічвалася больш за 12 тысяч экспанатаў.

**2 снежня** 1886 году ў вёсцы Капланцы былога Ігуменскага павету нарадзіўся Мікола Равенскі, якога музыколагі называюць беларускім кампазіратам нумар адзін. Абсалютна ўсё, што напісана Равенскім, створана па-беларуску. Самы вядомы твор Равенскага – гімн-малітва «Магутны Божа» на верш Наталлі Арсенневай.

**4 снежня** 1939 году горад Беласток быў абвешчаны абласным цэнтрам БССР. Пасля вайны Беласток разам з цэлым рэгіёнам будзе аддадзены Польшчы, але там і сёння жыве шмат беларусаў.

**6 снежня** 1520 году ў Нясвіжы нарадзілася Барбара Радзівіл. Кажуць, што яна была адзінай каралевай у еўрапейскай гісторыі, якая выйшла замуж па каханні. Першай дзяржаўнай асобай у нашых краях яна прабыла толькі год, загінула ад атруты – цалкам у духу шэкспіраўскіх трагедый. Сёння Барбару Радзівіл памятаюць і ўшаноўваюць у Літоўскай Рэспубліцы, дзе ейным імем названыя вуліцы гарадоў, кавярні і нават дзяржаўны ордэн Барбары Радзівіл, якім, між іншых, была ўзнагароджана расійская артыстка балета Мая Плісецкая.

Блакітны агеньчык

# “УРЭМЯЧКА” ВЫБРАЛА НАС

## ТЭЛЕБАЧАННЕ Ў ПОШУКАХ ІДЭАЛЬНАГА БЕЛАРУСА

Трэба аддаць належнае стваральнікам новай тэлеперадачы. У адрозненне ад астатніх, яны не сталі пераймаць у расійскіх калегаў ідэю, тэмы, аздабленне, музыку, манеру вядзення. Яны проста ўзялі перадачу “Аўтарскага тэлебачання” (якое пачало выходзіць яшчэ на ЦТ) “Времечко”, дадалі да яго слова “белорусское” і перанеслі на канал “Лад”. І яшчэ запрасілі ў студыю маскоўскага журналіста – аднаго з вядучых згаданай праграмы, якая выходзіць зараз на маскоўскім канале ТВЦ. Праўда, калі б вядучых не прадставілі, здагадацца, хто з іх расійскі журналіст, а хто беларускі, было б не так проста.

Атрымалася “Белорусское времечко”, якое будзе выходзіць цяпер штодня, амаль адначасова з галоўнай інфармацыйнай праграмай БТ “Панарама”.

Што ўжо само па сабе выглядае смела. Асабліва, калі ўлічыць, што перадача выходзіць у жывым эфіры – ад гэтага і беларускія гледачы і вядучыя беларускіх тэлеканалаў даўно адвыклі (калі не лічыць наўпроставых трансляцыяў прамоваў кіраўніка дзяржавы). Гэты фактар, відаць, і згуляў са стваральнікамі праграмы злы жарт.

Нічога крамольнага ў эфіры, зразумела, не было. Большасць сюжэтаў былі прысвечаныя старым, як само тэлебачанне, праблемам: бацька п’е, з-за чаго дзеці ў сям’і недаядаюць, вада ў нейкім падвале цячэ, у другім падвале блохі, каб ім ліха, пакусалі дзяцей і г.д. Самым запамінальным атрымаўся сюжэт пра старога дзядзьку ў Гродне, які высвістывае на лісцях розныя мелодыі для мінакоў і тым зарабляе на жыццё. (Для больш важных сюжэтаў у горадзе, дзе ўлады разбураюць гістарычны цэнтр, стваральнікі, відаць, не знайшлі “ўрэмечка”).




**Тры кампаненты** *беларускай стабільнасці.*

Але аўтары на самым пачатку задалі высокую планку для інтэрактыўнай размовы: яны прапанавалі гледачам прысылаць адказы на пытанне: “Хто такі ідэальны беларус?” Адказаў было шмат – СМС-паведамленні можна было бачыць унізе тэлеэкрана. І вядучыя беспамылкова выбіралі з іх… самыя банальныя. Ідэальны беларус – “добры”, “вельмі добры”, “працавіты”, “трудяга”, “бландын з блакітнымі вачыма”, “многоязычный” (!).

Праўда, у сюжэтах з глыбінкі, падрыхтаваных да перадачы, а яшчэ больш – у тэлефанаваннях у студыю той самы беларус выглядаў трошкі йнакш. Хоць і добрым празмерна, але нясмелым, скаваным, нават забітым, крыху тупаватым, смурным. Адзінае, што ён можа выразна вымавіць – “дапамажыце закрыць кран у падвале”. Калі нехта з гледачоў хацеў выказаць крытыку, і яго званок далі ў эфір, ён сумеўся: “Ды не, што вы, я проста так, выпадкова ўбачыў кавалак вашай перадачы…”

Такі атрымаўся ідэальны беларус у аўтараў “Времечка”, незалежна ад іх суб’ектыўнага жадання. А самыя важныя, змястоўныя СМС-кі журналісты не захацелі заўважыць. “Ідэальны беларус – той, хто гаворыць на беларускай мове”. Гэта быў адзіны адказ па-беларуску…

І яшчэ адзін дасціпны адказ – “чалавек з Гродна, які свісціць”. Лепшы сімвал для першага выпуску “Белорусского времечка”, сапраўды, цяжка падабраць.

**Максім Пешкаў**

**МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ**

**VILNIA.COM**

**ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ**

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер”
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў